Анатоль ЖЫТКО

# Дваранскае прамысловае прадпрымальніцтва ў Беларусі (1861–1914 гг.)

**В**ажная роля ў эканамічным жыцці беларускага краю належала дваранам-памешчыкам. Яшчэ да рэформы 1861 г. яны валодалі асноўнымі сродкамі вытворчасці (зямлёй, рабочай сілай, сыравінай, прамысловымі прадпрыемствамі і інш.).

У сувязі з рэформай усе прадпрыемствы, заснаваныя на працы прыгонных сялян, закрыліся альбо былі пераведзены на вольнанаёмную працу. Прамысловасць атрымала неабмежаваныя рэзервы рабочай сілы — абеззямеленых і пралетарызаваных сялян, а таксама рынак для збыту сваёй прадукцыі, які пастаянна пашыраўся за кошт разбурэння натуральнай і паўнатуральнай памешчыцкай і сялянскай гаспадарак. Развіццю прамысловасці садзейнічалі і хуткае будаўніцтва чыгунак, шашэйных дарог, павелічэнне попыту на лесаматэрыялы, спірт, прадукты хімічнай прамысловасці, якая працавала на мясцовай сыравіне. Паводле няпоўных і супярэчлівых дадзеных, колькасць дваранска-памешчыцкіх цэнзавых прадпрыемстваў пастаянна павялічвалася. Так, у 1860-я гг. у 35 беларускіх паветах Гродзенскай, Віленскай, Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губерняў дзейнічалі 94 дваранскія мануфактуры і фабрыкі (83% ад іх агульнай колькасці). Паводле нашых падлікаў, у 1901 г. толькі фабрык і заводаў у руках дваран было 454, што складала прыкладна 53% ад іх агульнай колькасці, а ў 1913 г. – 615 (48,0%)[1].

Такім чынам, з 1860-х гг. да 1913 г. колькасць дваранска-памешчыцкіх прадпрыемстваў цэнзавай прамысловасці павялічылася ў 6,5 раза, але доля іх сярод іншых саслоўяў паменшылася ў 1,7 раза. Гэта азначае, што буржуазная прамысловасць развівалася значна большымі тэмпамі, чым прамысловасць памешчыкаў, якія сталі буржуа. Разам з тым, вызначыць дакладна колькасць рабочых на фабрыках і заводах і суму іх вытворчасці па саслоўнай прыналежнасці вельмі складана. На падставе "Списка фабрик и заводов Европейской России" намі ўстаноўлена, што ў 1901 г. на дваранскіх прадпрыемствах з паравымі рухавікамі колькасць рабочых склала 8 333 чалавекі, а сума вытворчасці — 11 877 тыс. руб. Паводле дадзеных эканаміста М.Р.Матусевіча, у 1900 г. колькасць рабочых на цэнзавых прадпрыемствах дваран і памешчыкаў складала 3,9 тыс. чалавек, а ў 1913 г. — 5,9 тыс. Валавая прадукцыя на гэтых прадпрыемствах павялічылася з 6 813 тыс. руб. у 1900 г. да 11 390 тыс. руб. у 1913 г. (*гл. табл. 2*).

На жаль, спасылкі на крыніцы і методыка падлікаў у працы М.Матусевіча адсутнічаюць

*ЖЫТКО Анатоль Паўлавіч – кандыдат гістарычных навук, дацэнт, загадчык кафедры славянскай гісторыі і метадалогіі гістарычнай навукі БДПУ імя Максіма Танка. Нарадзіўся ў в. Менічы Ляхавіцкага раёна Брэсцкай вобл. Скончыў гістарычны факультэт МДПІ імя М.Горкага (1979 г.), аспірантуру (1986 г.). Распрацоўвае праблему "Дваранства Беларусі перыяду капіталізму". Аўтар больш за 40 навуковых і метадычных артыкулаў, сааўтар школьных праграм па гісторыі Беларусі, метадычнага дапаможніка і падручніка "Мая Радзіма – Беларусь" для вучняў 4-га класа.*



*Табліца 1*

## Дваранская фабрычна-завадская вытворчасць у 1901 г.[2]

| Галіны вытворчасці | Сума вытворчасці (руб.) | % | Колькасць рабочых, чалавек | % | Колькасць прадпрыемстваў | % |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Апрацоўка шэрсці | 311 700 | 2,6 | 365 | 4,4 | 5 | 1,1 |
| Апрацоўка шоўку | 79 300 | 0,7 | 330 | 4,0 | 3 | 0,7 |
| Папяровая і паліграфічная вытворчасць | 2 049 300 | 17,3 | 1324 | 15,9 | 9 | 2,0 |
| Механічная апрацоўка дрэва | 818 500 | 6,9 | 552 | 6,6 | 25 | 5,5 |
| Апрацоўка металаў, вытворчасць машын і інш. | 618 100 | 5,2 | 445 | 5,3 | 9 | 2,0 |
| Апрацоўка жывёльных прадуктаў | 203 800 | 1,7 | 82 | 1,0 | 4 | 0,9 |
| Апрацоўка харчовых і пажыўных рэчываў | 6 639 600 | 55,9 | 3 394 | 40,7 | 373 | 82,1 |
| Апрацоўка мінеральных рэчываў | 1 079 390 | 9,1 | 1 752 | 21,0 | 23 | 5,1 |
| Хімічная вытворчасць | 77 800 | 0,6 | 89 | 1,1 | 3 | 0 ,7 |
| Разам | 11 877 490 | 100,0 | 8 333 | 100,0 | 454 | 100,0 |

*Табліца 2*

## Дынаміка росту дваранскіх і памешчыцкіх цэнзавых прамысловых прадпрыемстваў[3]

| Уласнікі | Колькасць прадпрыемстваў | | | Колькасць рабочых (тыс. чалавек) | | | Валавая прадукцыя (тыс. руб.) | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1900 г. | 1913 г. | 1913 г. у % да 1900 г. | 1900 г. | 1913 г. | 1913 г. у % да 1900 г. | 1900 г. | 1913 г. | 1913 г. у % да 1900 г. |
| Памешчыкі і дваране | 430 | 615 | 143,0 | 3,9 | 5,9 | 151,4 | 6 813,0 | 11 390,0 | 167,2 |
| Удзельная вага | 53,8 | 48,0 | — | 12,6 | 10,8 | — | 17,7 | 12,9 | — |
| Уся прамысловасць | 799 | 1 282 | 160,4 | 31,1 | 54,9 | 176,7 | 38 448,7 | 88 295 | 229,6 |

Нягледзячы на гэта, можна сцвярджаць, што амаль палова фабрычна-завадскіх прадпрыемстваў на пачатку XX ст. належала дваранам, на іх долю прыпадалі і значная частка рабочых і сума вытворчасці. Пра дынаміку развіцця фабрычна-завадской прамысловасці можна меркаваць на падставе дадзеных табліцы 3, складзенай аўтарам паводле "Списка фабрик и заводов Европейской России".

Да рэформы 1861 г. на сучаснай тэрыторыі Беларусі было заснавана 86 дваранскіх прадпрыемстваў з паравымі рухавікамі. У 1860—1870-я гг. працэс адкрыцця новых фабрык і заводаў запаволіўся. Відавочна, на гэта паўплывалі тыя самыя прычыны, якія стрымлівалі і развіццё памешчыцкай сельскагаспадарчай вытворчасці. Гэта 10% кантрыбуцыйны збор з памешчыцкіх маёнткаў, ваеннае становішча, адмена часоваабавязанага стану сялян і інш.

Ажыўленне дваранскага прамысловага прадпрымальніцтва пачынаецца ў 1880-я гг., калі было заснавана 87 (19,2%) прадпрыемстваў з паравымі рухавікамі. 1890-я гады — перыяд прамысловага пад'ёму. У гэты час, паводле нашых падлікаў, узнікла 210 фабрык і заводаў, што склала 46,3% ад іх агульнай колькасці ў 1901 г.

У парэформенныя гады колькасць дваран сярод уладальнікаў фабрык і заводаў пастулова скарачалася. Так, у 1860—1869 гг. суадносіны ўласнікаў-дваран і ўласнікаў-купцоў ва ўсёй буйной прамысловасці былі як 5,2:1,0, у асобных галінах, як, напрыклад, харчовай — як 13,8:1,0, дрэваапрацоўчай — як 2,5:1,0, тэкстыльнай — як 0,3:1,0, гарбарна-абутковай, металаапрацоўчай — як 2,5:1,0. У гарбарна-абутковай, металаапрацоўчай, сілікатна-будаўнічай і хімічнай галінах амаль што ўсе мануфактуры і фабрыкі належалі дваранам. У 1890-я гг. працавалі 398 буйных дваранскіх прадпрыемстваў: 293 купецкіх, 89 мяшчанскіх і 16 дзяржаўных і акцыянерных таварыстваў. Суадносіны ўласнікаў-дваран і ўласнікаў-купцоў склалі ўжо як 1,2:1,0, а ў асобных галінах, такіх як харчовая — як

*Табліца 3*

## Гады заснавання дваранскіх фабрык і заводаў

| Губерні | Колькасць фабрык і заводаў | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | да 1860 г. | 1860-я гг. | 1870-я гг. | 1880-я гг. | 1890-я гг. | разам |
| Віленская (4 паветы) | 17 | 3 | 6 | 19 | 21 | 66 |
| Віцебская (5 паветаў) | 9 | 3 | 3 | 6 | 16 | 37 |
| Гродзенская (6 паветаў) | 22 | 13 | 8 | 20 | 40 | 103 |
| Мінская | 10 | 3 | 5 | 17 | 53 | 88 |
| Магілёўская | 28 | 6 | 21 | 25 | 80 | 160 |
| Разам | 86 | 28 | 43 | 87 | 210 | 454 |

1,8:1,0; дрэваапрацоўчая — як 2,1:1,0; тэкстыльная — як 0,1:1,0. На прадпрыемствах у металаапрацоўчай, сілікатнабудаўнічай і хімічнай галінах, якія раней поўнасцю належалі дваранам, цяпер важную ролю адыгрывалі купцы. Гарбарныя мануфактуры і фабрыкі ў гэтым дзесяцігоддзі ўжо поўнасцю належалі непрывілеяваным саслоўям[4].

Самае важнае месца ў дваранскай фабрычна-завадской вытворчасці займала апрацоўка харчовых і пажыўных рэчываў. У 1901 г. на яе долю прыпадалі 373 прадпрыемствы з паравымі рухавікамі (82,1%), на якіх працавалі 3 394 рабочых (40,7%), сума вытворчасці складала 6 639,6 тыс. руб. (55,9%) (*гл. табл. 1*). Значную ролю тут адыгрывала вінакурэнне, якое з'яўлялася традыцыйным для дваранскай прамысловасці.

Адносна маладой вытворчасцю, якая належала дваранам, з'яўлялася крухмальна-патачная. Першы такі завод узнік у 1873 г. у Магілёўскай губерні. Пік заснавання заводаў гэтага тыпу прыпадае на прамысловы пад'ём 1890-х гг. З 32 прадпрыемстваў 27 былі заснаваны ў Магілёўскай і Гродзенскай губернях менавіта ў гэты час. У Беларусі крухмальна-патачныя заводы былі невялікіх памераў. У сярэднім на адным прадпрыемстве працавалі 12—13 рабочых. Сума вытворчасці гэтых заводаў складала 367,3 тыс. руб. (73,7%) (*гл. табл. 4*).

Мукамольная вытворчасць у Беларусі з'яўлялася традыцыйнай. У 1860—1870-я гг. дваранска-памешчыцкія млыны працавалі пры дапамозе вады, ветру і цяглавай сілы. Прамысловы пераварот у гэтай галіне пачынаецца ў 1880-я гг. Большасць паравых млыноў узнікае ў 1890-я гг.

У 1901 г. 30 млыноў мелі ўжо паравыя рухавікі. На млынах працавалі 176 рабочых, а сума вытворчасці складала 369,9 тыс. руб. Асноўная колькасць млыноў (12) была сканцэнтравана ў Магілёўскай губерні, яны выпусцілі прадукцыі на суму 194,9 тыс. руб. (52,7% ад сумы ўсіх паравых дваранскіх млыноў) (*гл. табл. 5*).

Пасля рэформы 1861 г. у Мінскай і Магілёўскай губернях захаваліся 4 буйныя цукровыя заводы. На заводзе Скірмунта ў Парэччы ў 1879 г. налічвалася 168 рабочых, было выраблена 8 тыс. пудоў рафінаду коштам 48 тыс. руб. (у 1860-я гг. сярэднегадавая вытворчасць складала 90 тыс. руб.)[6]. На заводзе Паскевіча ў Гомелі ў 1879 г. працавалі 232 чалавекі, было выраблена 15 тыс. пудоў цукру коштам 64,5 тыс. руб.[7].

*Табліца 4*

## Дваранскія крухмальна-патачныя заводы ў 1901 г.[5].

| Губерні | Колькасць заводаў | Сума вытворчасці | Колькасць рабочых |
|---|---|---|---|
| Віленская (4 паветы) | 1 | 33 800 | 16 |
| Гродзенская (6 паветаў) | 10 | 172 400 | 119 |
| Мінская | 4 | 26 800 | 48 |
| Магілёўская | 17 | 194 900 | 228 |
| Разам | 32 | 427 900 | 411 |

Крупадзёрная вытворчасць была сканцэнтравана ў асноўным у Магілёўскай губерні. Са 144 крупадзёрак ва ўласнасці дваран знаходзілася 31 (21,5%). Гэта былі дробныя прадпрыемствы. Агульная колькасць рабочых на іх складала ўсяго 45 чалавек, а валавы даход — 1 161 тыс. руб. Да 1881 г. у губерні былі заснаваны 18 крупяных заводаў (12 з іх належалі дваранам) з валавым даходам 66,2 тыс. руб.[8]

У 1901 г. сярод паравых прадпрыемстваў Беларусі па перапрацоўцы шэрсці 5 належа

Табліца 5

**Дваранскія паравыя млыны ў 1901 г.**[9].

| Губерні | Колькасць млыноў | Сума вытворчасці | Колькасць рабочых |
|---|---|---|---|
| Віленская (4 паветы) | 2 | 40 000 | 11 |
| Віцебская (5 паветаў) | 6 | 98 700 | 30 |
| Гродзенская (6 паветаў) | 6 | 47 900 | 43 |
| Мінская | 4 | 24 400 | 22 |
| Магілёўская | 12 | 194 900 | 70 |
| Разам | 30 | 369 900 | 176 |

дваранам. Сума вытворчасці складала 311,7 тыс. руб. Найбольш вядомай была суконная фабрыка Скірмунта ў маёнтку Парэчча Пінскага павета. У 1865 г. сума яе валавой вытворчасці складала 214 тыс. руб.[10]. У 1879 г. на гэтай фабрыцы 420 рабочых працавалі на 2 паравых і 10 прадзільных машынах, сума вытворчасці дасягнула 300 тыс. руб. На суконнай фабрыцы Пуслоўскага ў маёнтку Альбярцін Слонімскага павета ў 1879 г. былі задзейнічаны 475 рабочых; гадавая вытворчасць прадпрыемства складала 254,6 тыс. руб. Буйной фабрыкай можна лічыць фабрыку двараніна Слатвінскага, што знаходзілася ў маёнтку Раванічы Ігуменскага павета. На ёй працаваў 101 рабочы, гадавая вытворчасць складала 38,2 тыс. руб.[11].

Акрамя суконных фабрык у памешчыкаў Беларусі налічвалася значная колькасць дробных сукнавальняў, механізмы якіх прыводзіліся ў рух звычайна з дапамогай вады. Толькі ў Магілёўскай губерні ў 1881 г. з 232 сукнавальняў дваранам належалі 200 (86,2%). На іх быў задзейнічаны 201 рабочы, а валавы даход складаў 17,8 тыс. руб.[12].

У 1890-я гг. дваране заснавалі 3 фабрыкі па апрацоўцы шоўку. Фабрыка Слізеня ў маёнтку Лахозва Навагрудскага павета ўзнікла ў 1896 г. У 1901 г. на ёй працавалі 125 рабочых, сума гадавой вытворчасці складала 33,6 тыс. руб. 108 рабочых фабрыкі Пуслоўскага ў маёнтку Альбярцін Слонімскага павета выраблялі прадукцыі на суму 24,6 тыс. руб., а фабрыка графа Тышкевіча і двараніна Маральскага ва ўрочышчы Фалют Гродзенскага павета выпусціла прадукцыі на суму 21,1 тыс. руб.[13].

Значнае месца ў дваранскай фабрычна-завадской вытворчасці займала папяровая і паліграфічная вытворчасць. У 1901 г. на 9 прадпрыемствах з паравымі рухавікамі працавалі 1 324 рабочых, кошт прадукцыі складаў 2 049,3 тыс. руб. (*гл. табл. 1*). Найбольш вядомай была фабрыка князя Паскевіча ў Добрушы Гомельскага павета, заснаваная ў 1872 г. У 1878 г. яна была акцыяніравана. Былі ўстаноўлены 2 буйныя турбіны і 2 паравыя машыны. Адной з першых у Беларусі фабрыка была электрыфікавана. У 1879 г. на ёй працавалі 460 чалавек, сума вытворчасці складала 255 тыс. руб. На пачатку XX ст. колькасць рабочых дасягнула 900 чалавек, сума вытворчасці — 1 601,7 тыс. руб.[14].

У 1886 г. узнікла папяровая фабрыка Валадковіча "Скіна" ў вёсцы Бліж Лепельскага павета. На ёй у 1901 г. налічваўся 231 рабочы, працаваў лакамабіль, сума вытворчасці складала 301,2 тыс. руб. У 1900 г. граф Браэль-Плятэр заснаваў у вёсцы Плятэр Дзісенскага павета кардонную фабрыку, дзе працавалі 54 чалавекі, сума вытворчасці складала 46,7 тыс. руб.[15].

Значныя лясныя масівы, якія належалі памешчыкам, з'яўляліся сыравіннай базай для развіцця вытворчасці па перапрацоўцы лесу і лесаматэрыялаў. Да рэформы 1861 г. памешчыкі практычна не займаліся перапрацоўкай драўніны. Звычайна яны прадавалі лес перакупшчыкам на пні. У Беларусі налічвалася нязначная колькасць лесапільных прадпрыемстваў. У 1862 г. памешчык Ястражымбскі заснаваў лесапільны завод у Магілёве. З дапамогай паравой машыны 5 рабочых напілавалі 8 тыс. брусоў на суму 700 руб.[16]. У 1865 г. была зарэгістравана адна лесапільня ў Суражскім павеце[17]. У 1866 г. у Брэсцкім павеце ўладальніцай лесапільні з'яўлялася графіня Красінская, а ў Мінскай губерні ў 1876 г. быў зарэгістраваны толькі адзін дваранскі лесапільны завод[18].

Прамысловы пад'ём 1890-х гг. станоўча паўплываў і на развіццё вытворчасці па механічнай апрацоўцы дрэва. З 25 лесапільняў з паравымі рухавікамі, якія дзейнічалі ў 1901 г., 24 былі заснаваны менавіта ў гэты перыяд. На іх працавалі 552 рабочых, сума вытворчасці складала 818,5 тыс. руб. (6,9% ад усёй дваранскай фабрычна-завадской вытворчасці) (*гл. табл. 1*). Найбольш буйнымі былі лесапільня двараніна Багуслаўскага ў в. Рудня Рэчыцкага павета (23 рабочых, сума вытворчасці — 132,4 тыс. руб.) і коркавы завод Каневіча і Яленскага ў г. Пінску (55 рабочых, сума вытворчасці — 110,2 тыс. руб.)[19].

У 1900—1913 гг. у Беларусі працавалі 139 новых лесапільных заводаў, што ў 1913 г. склала $^{3}/_{4}$ усіх прадпрыемстваў такога тыпу. Адным з буйнейшых быў лесапільна-бандарны завод князя Радзівіла ў маёнтку Дзянісавічы Слуцкага павета. Колькасць рабочых была каля 150 чалавек[20].

Прамысловы пераварот, які ахапіў Беларусь у парэформенны перыяд, паўплываў на стварэнне прадпрыемстваў па апрацоўцы металаў, выпуску машын і г. д. Яшчэ ў 1850-я гг. на Старынкаўскім Чэрыкаўскага павета графа Бенкендорфа і Барысаўскім (Чарняўскім) металургічных заводах (апошні належаў вялікаму князю Мікалаю Мікалаевічу Раманаву[21]) крычны спосаб атрымання жалеза быў заменены пудлінгавым. На буйнейшым у Беларусі Старынкаўскім заводзе да 1863 г. працавала каля 900 рабочых. У 1862 г. было выплаўлена чыгуну на 246 тыс. руб. Але ў сувязі з ліквідацыяй прыгоннай працы і пасля смерці ўласніка завод у 1867 г. спыніў сваю дзейнасць[22].

Да пачатку 1870-х гг. у Беларусі дзейнічалі яшчэ 2 чыгуналіцейныя і медзеплавільны заводы ў Магілёўскай губерні (17 рабочых і сума вытворчасці — 2 887 руб.) і медзеплавільны і жалезаапрацоўчы заводы ў Мінскай губерні, уладальнікамі якіх былі дваране[23].

У 1884 г. у Пінску баронам О'Гарыен дэ Ласі быў заснаваны суднабудаўнічы завод. Праз 10 гадоў у маёнтку Альбрэтава Пінскага павета пачалі выпускаць прадукцыю чыгуналіцейны і механічны заводы. На іх выраблялiся параходы, паравыя машыны для бровараў. На Пінскім заводзе ў 1900 г. працавалі 183 чалавекі, сума вытворчасці складала 132,9 тыс. руб. На драцянацвіковым заводзе Папова ў в. Барань Аршанскага павета (заснаваны ў 1873 г.) у 1880 г. працавалі 57 чалавек. Іх заробак за 260 рабочых дзён вагаўся ад 120 да 900 руб.[24]. У 1901 г. на гэтым заводзе былі задзейнічаны 99 чалавек, сума вытворчасці складала 370,6 тыс. руб.[25].

Дваранская хімічная прамысловая вытворчасць была ў асноўным звязана з перапрацоўкай дрэва і яго адыходаў. Гэта вытворчасць была прадстаўлена пераважна дробнымі смалільнымі, шкіпінарнымі і дзягцярнымі прадпрыемствамі. Так, у 1865 г. у беларускіх паветах Віцебскай губерні налічвалася 6 смалакурных і дзягцярных прадпрыемстваў з 21 рабочым і сумай вытворчасці 4 102 руб.[26]. У 1866 г. у беларускіх паветах Гродзенскай губерні дзейнічалі 6 шкіпінарных прадпрыемстваў. Усе яны належалі памешчыкам[27]. У 1876 г. сума вытворчасці 15 дваранскіх смалільных і дзягцярных заводаў Мінскай губерні раўнялася ўсяго 6 106 руб.[28]. У Магілёўскай губерні ў 1881 г. з 59 дзягцярных, смалільных і шкіпінарных пр прыемстваў 32 (54,2%) з'яўляліся ўласнас дваран, на іх працавалі 119 чалавек, валавы ход складаў 26 148 руб.[29]. Для перапрац звычайна выкарыстоўваліся пні ці сма хвойных парод. Таму памер гэтых пр прыемстваў залежаў ад колькасці і якасці л ў таго ці іншага памешчыка. Толькі ў 1887 Гродзенскай губерні было заснавана перш дваранскае прадпрыемства з паравым ру вiком. На гэтым смалільна-шкіпінарным завод ў 1901 г. былі задзейнічаны 4 рабочыя, а с вытворчасці складала 1 600 руб. У 1894 г. у цебскай губерні пачаў работу дваранскі хіміч завод з 38 рабочымі і сумай вытворчасці ў 2 тыс. руб. У 1899 г. у Магілёўскай губерні б заснаваны завод па сухой перагонцы дрэва 1901 г. на ім працавалі 47 чалавек, су вытворчасці складала 46,3 тыс. руб.[30].

Вытворчасць па апрацоўцы мінеральных чываў была звязана з выпускам будаўнічай п дукцыі. У парэформенны перыяд у Белар дзейнічаў шэраг памешчыцкіх дробных цагельн прадпрыемстваў па выпуску вапны і шкла. П дукцыя іх выкарыстоўвалася як на патрэ маёнткаў, так і на продаж. Паводле дадзеных 1866 г., у Лепельскім павеце 3 з 9 цагельн належалі памешчыкам (5 рабочых, сума выты часці — 1 400 руб.), у Віцебску — 2 заводы рабочых, сума вытворчасці — 2 600 руб.)[31]. У гэ ж час у беларускіх паветах Гродзенскай губе ва ўласнасці памешчыкаў было 15 цагельня 31. З 5 вапнавых прадпрыемстваў 3 бы дваранскія[32]. У Мінскай губерні ў 1876 г. дзейніч 14 дваранскіх прадпрыемстваў па выпуску цэгл і вапны на суму 1 483 руб.[33]. На пачатку 1880-х у Магілёўскай губерні 16 дваранскіх цагельняў (ш складала 23,2% ад іх агульнай колькасці) дава даход у 9,8 тыс. руб., на іх працавалі 62 рабочы Акрамя гэтага з 7 кафельных заводаў паме чыкам Магілёўшчыны належалі 3 (42,9%). гадавы даход складаў 17 тыс. руб. Памешчыц былі і 3 вапнавыя прадпрыемствы з 10[34].

Невялікія прадпрыемствы па выпуску шк з'явіліся яшчэ ў дарэформенны перыяд. У 1866 у Лепельскім павеце дзейнічалі 2 дваранс шклозаводы, на якіх працавалі 43 чалавекі, су вытворчасці складала 23 тыс. руб.[35]. У Магілёўск губерні 3 з 4 шклозаводаў належалі дваранам ( рабочыя, сума даходу — 18 тыс. руб.)[36].

У 1901 г. у вытворчасці будаўнічых матэрыял налічваліся 23 дваранскія прадпрыемствы з пар вымі рухавікамі. На іх было сканцэнтравана 1 7 рабочых, сума вытворчасці дасягнула 1 079,4 ты руб. (9,1% ад усёй дваранскай фабрычна-з вадской вытворчасці) (*гл. табл. 1*). Найболь вядомымі былі хрустальныя фабрыкі "Нёман

ва ўрочышчы Вустрань і "Нёман Б" ва ўрочышчы Магадзіно Лідскага павета, заснаваныя дваранамі Краеўскім і Столле. На гэтых двух заводах у 1901 г. працавалі 640 чалавек, сума вытворчасці складала 258,6 тыс. руб. Па ініцыятыве Краеўскага ў 1898 г. сумесна з Панкевічам быў адкрыты і шклозавод "Барысаў", на якім у 1901 г. працавалі 170 рабочых, сума вытворчасці дасягнула 78,1 тыс. руб. У 1899 г. Краеўскі і Столле заснавалі фабрыку аконнага шкла ў в. Ганцавічы Слуцкага павета. У 1870, 1886 і 1889 гг. князем Друцкім-Любецкім былі лабудаваны 3 цагельныя заводы ў Гродзенскім павеце. У 1901 г. на іх працавалі 83 рабочыя, было выраблена 5,5 млн. штук цэглы на суму 44 тыс. руб.[37].

Сярод прадпрыемстваў па апрацоўцы прадуктаў жывёлагадоўлі выдзяляўся стэарынавы завод у маёнтку Альбрэхтава Пінскага павета. У канцы 1860-х гг. на ім працаваў 121 чалавек, выраблялася свечак на 219 тыс. руб., мыла — на 50 тыс. і алеіну — на 30 тыс. руб. Завод быў абсталяваны 2 паравымі катламі, 7 гідраўлічнымі прэсамі, лакамабілямі. У сувязі з далейшай механізацыяй вытворчых працэсаў колькасць рабочых паменшылася амаль што ў 2 разы. У 1900 г. тут ужо працавалі 66 чалавек, сума вытворчасці складала 275 тыс. руб.[38].

Такім чынам, у дваранскай прамысловай вытворчасці ў парэформенныя гады наглядаўся двухбаковы працэс. З аднаго боку, колькасць дваранскіх прадпрыемстваў пастаянна павялічвалася. Сума вытворчасці, колькасць рабочых на прадпрыемствах павялічвалася, але тэмпы гэтых прыростаў адставалі ад развіцця фабрык і заводаў, якія належалі непрывілеяваным саслоўям. Гэта заканамерны вынік капіталізацыі народнай гаспадаркі ў цэлым. Дваранская прамысловая вытворчасць, якая ў асноўным базіравалася на мясцовай сыравіне, перажыла тыя ж самыя фазы пад'ёму і спаду, што і прамысловасць Расійскай імперыі ў цэлым.

---

[1] Болбас М.Ф. Промышленность Белоруссии. 1860—1900. Мн., 1978. С. 118—119.

[2] Табліца складзена аўтарам па дадзеных кнігі "Список фабрик и заводов Европейской России". СПб., 1903. С. 41—738.

[3] Экономика Белоруссии в период империализма / Под ред. Г.Т.Ковалевского и др. Мн., 1963. С. 53.

[4] Болбас М.Ф. Промышленность Белоруссии. 1860—1900. С. 116.

[5] Табліца складзена аўтарам па дадзеных кнігі "Список фабрик и заводов Европейской России". С. 41—738.

[6] Труды Минского губернского статистического комитета. Историко-статистическое описание девяти уездов Минской губернии. Вып. 1. Мн., 1867. С. 74—75.

[7] Орлов П. Указатель фабрик и заводов Европейской России. СПб., 1881. С. 551.

[8] Опыт описания Могилевской губернии. Кн. 2. Могилев, 1883. С. 189—191.

[9] Табліца складзена аўтарам па дадзеных кнігі "Список фабрик и заводов Европейской России". С. 41—738.

[10] Труды Минского губернского статистического комитета. Историко-статистическое описание девяти уездов Минской губернии. С. 74.

[11] Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі. Т. 2. Мн., 1940. С. 714.

[12] Опыт описания Могилевской губернии. С. 165—168.

[13] Список фабрик и заводов Европейской России. С. 81, 83.

[14] Болбас М.Ф. Промышленность Белоруссии. 1860—1900. С. 83; Список фабрик и заводов Европейской России. С. 150.

[15] Список фабрик и заводов Европейской России. С. 133. 134.

[16] НГАБ. Ф. 201, воп. 1, спр. 868, арк. 15.

[17] Памятная книжка Витебской губернии на 1866 год. СПб., 1866. С. 131.

[18] Список фабрик и заводов Европейской России. С. 205, 206.

[19] Экономика Белоруссии в период империализма. С. 53.

[20] Там жа.

[21] Труды Минского губернского статистического комитета. Историко-статистическое описание девяти уездов Минской губернии. С. 297.

[22] НГАБ. Ф. 201, воп. 1, спр. 868, арк. 29; Болбас М.Ф. Промышленность Белоруссии. 1860—1900. С. 76—77.

[23] Опыт описания Могилевской губернии. С. 192—193; Список фабрик и заводов Европейской России. С. 114, 153.

[24] Опыт описания Могилевской губернии. С. 265—268.

[25] Список фабрик и заводов Европейской России. С. 280.

[26] Памятная книжка Витебской губернии на 1866 год. С. 130—136.

[27] НГАБ у Гродна. Ф. 1, воп. 28, спр. 1049, арк. 388-395.

[28] Гл.: Список землевладельцев Минской губернии за 1876 год. Мн., 1877. С. 3—185.

[29] Опыт описания Могилевской губернии. С. 189—191.

[30] Список фабрик и заводов Европейской России. С. 729, 731, 738.

[31] Памятная книжка Витебской губернии на 1866 год. С. 122—139.

[32] НГАБ у Гродна. Ф. 1, воп. 28, спр. 1049, арк. 388—395.

[33] Гл.: Список землевладельцев Минской губернии за 1876 год. С. 3—185.

[34] Гл.: Опыт описания Могилевской губернии. С. 149—194.

[35] Памятная книжка Витебской губернии на 1866 год. С. 122—129.

[36] Опыт описания Могилевской губернии. С. 122—129.

[37] Список фабрик и заводов Европейской России. С. 342—344, 350, 368, 369.

[38] Болбас М.Ф. Промышленность Белоруссии. 1860—1900. С. 79—80.